

# ГРОМ
## Уладзімір Мікалаевіч
### (20.12.1951 — 10.12.2008)

Прапагандыст народнай традыцыйнай песенна-інструментальна-харэаграфічнай творчасці, заснавальнік і мастацкі кіраўнік Заслужанага аматарскага фальклорнага ансамбля «Крупіцкія музыкі». Заслужаны работнік культуры Беларусі (1986).

З 1976 года і да апошняга дня У. Гром працаваў дырэктарам Крупіцкага цэнтра культуры Мінскага раёна, на базе якога стварыў унікальны па сваім складзе ансамбль беларускіх народных інструментаў «Крупіцкія музыкі». Сам Уладзімір Мікалаевіч, які нарадзіўся ў вёсцы Сямурадцы Жыткавіцкага раёна Гомельскай вобласці, зазначыў, што проста не мог не стаць музыкантам: «У палешукоў гістарычна склалася песенная культура. Спяваюць усе, прычым двухгалосce. Гэтаму не навучыш. Дзядзька і дзед ігралі на баяне і гармоніку. За імі і я пачаў іграць…» — казаў ён.

Усё жыццё Уладзімір Мікалаевіч збіраў, рэстаўрыраваў і займаўся ўдасканаленнем беларускіх народных інструментаў, накіроўваў усе сілы на стварэнне складу інструментаў сапраўды беларускага нацыянальнага аркестра (ансамбля). Майстар быў перакананы ў неабходнасці адкрыцця навукова-метадычных цэнтраў, якія б садзейнічалі ліквідацыі разрыву паміж тэорыяй і практыкай, паміж навукай, носьбітамі традыцый і папулярызатарамі, якія ўвасабляюць сцэнічна адаптаваныя інструментальныя традыцыі. Важнай вяхой у яго жыцці стала сустрэча і супрацоўніцтва з Інай Назінай, доктарам мастацтвазнаўства, прафесарам кафедры беларускай музыкі Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі. Яе кнігі, прысвечаныя народным музычным інструментам, сталі арыенцірам у пошуку калекцыйных інструментаў і стварэнні іх збораў.

Усяго У. Громам было сабрана больш за 100 інструментаў, большасць з якіх выкарыстоўвалася ў рэпертуары «Крупіцкіх музыкаў». Сярод найбольш цікавых экзэмпляраў дуда Івана Гвазда (рэканструкцыя У. Грома), «басок» дзеда беларускага паэта Беларусі Адама Русака (рэканструкцыя Дзмітрыя Кудзіна), старадаўняя басэтля (рэканструкцыя Усевалада Жукоўскага), а таксама гармонікі М. Гайдукевіча, дудкі І. Лычкоўскага і В. Пратасевіча, жалейкі В. Кульпіна. У. Жукоўскі таксама зрабіў для ансамбля скрыпку і альт, дзякуючы яму загучалі дудка, цымбалы, колавая ліра. Ёсць у калекцыі У. Грома старадаўняя гітара, якая належала І. Андруку — першаму настаўніку Уладзіміра Мікалаевіча, акарыны, выробленыя яго сынам Дзянісам, варганы, трашчоткі, калоткі і інш. Нельга не ўзгадаць і такія рэдкія інструменты, як фісгармонія і цытра.

Пошук рарытэтаў падахвочваў У. Грома да самастойнага вырабу інструментаў. Так у суаўтарстве з А. Шараметам была зроблена пастухова труба, а таксама створаны арыгінальны ансамбль з 33 падкоў, карпатлівая праца па настройцы патрэбнага ладу доўжылася 2 месяцы. Не меньш часу і сіл спатрэбілася, каб адладзіць строй вясковых чыгункоў. Сапраўдны фурор на міжнародным фальклорным фэсце ў Югаславіі ў 1984 годзе выклікала выкананне майстрам жніўнай мелодыі на саломцы.

У 2000—01 гадах на базе кафедры духавой музыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў была распачата падрыхтоўка студэнтаў па спецыяльнасці «Духавыя інструменты (народныя)». На працу ў гэтую навучальную ўстанову быў запрошаны і У. Гром. Ён жа стаў ініцыятарам стварэння ансамбля выкладчыкаў і студэнтаў «Гуды», перавёз у Мінск практычна ўсю калекцыю народных інструментаў і адкрыў на яе базе музей музычных інструментаў, які на доўгія гады прапісаўся ва ўніверсітэце. Музей У. Грома зрабіў значны ўнёсак у справу папулярызацыі беларускіх народных інструментаў — спадчыны традыцыйнай інструментальнай культуры.

Сёння калекцыя У. Грома займае пачэснае месца сярод збораў, створаных майстрамі, чыё жыццёвае крэда — зберагаць і развіваць традыцыйную спадчыну беларускай інструментальнай культуры.

РЭПАЗІТОРЫЙ БДУКІ